## УЛАДА — НА ПРАМОЙ ЛІНІІ

**Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах.**

Прыёмы пройдуць у Гродзенскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях па наступным графіку:

**16 чэрвеня 2017 года:**

БАРОЎКА Людміла Уладзіміраўна — начальнік аддзела па рабоце з грамадскімі аб'яднаннямі Адміністрацыі Прэзідэнта — Навагрудскі райвыканкам (10.00 — 13.00).

**17 чэрвеня 2017 года:**

КАЧАНАВА Наталля Іванаўна — кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта — Верхнядзвінскі райвыканкам (11.00 — 13.00)

ЛАЎРАНКОЎ Генадзь Міхайлавіч — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Магілёўскай вобласці — Горацкі райвыканкам (09.00 — 12.00) (прамая тэлефонная лінія);

12.00 — 14.00 (асабісты прыём грамадзян).

**20 чэрвеня 2017 года:**

ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Гомельскай вобласці — Добрушскі райвыканкам (11.00 — 13.00).

Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.

■ Парламенцкі дзённік

## Без прычын для затрымак

### Беларусь гатовая да актыўнага супрацоўніцтва з МВФ

**Аб гэтым заявіў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з прадстаўнікамі місіі Міжнароднага валютнага фонду. У нарадзе прыняў удзел кіраўнік місіі МВФ па Беларусі Пітэр ДОЛМАН.**

— Мы ў Беларусі зацікаўленыя ў тым, каб нашы адносіны з фондам былі актыўнымі, не павінна быць паўзаў, для гэтага няма ніякіх прычын, — адзначыў сенатар. — Таму я заклікаў бы да актыўнай працы. Можа, ёсць нейкія перашкоды, бар'еры, але я лічу, што яны не з'яўляюцца стратэгічнымі, і трэба актыўна развіваць узаемаадносіны.

Па словах старшыні Савета Рэспублікі, Беларусь хоча мець праграму з Міжнародным валютным фондам. «І не толькі дзеля падтрымкі плацежнага балансу, хоць гэта, вядома, важна, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Мы зацікаўлены ў маштабнай рабоце з прыватнымі інвестарамі. Адсутнасць праграмы ў пэўнай ступені стрымлівае гэты працэс». Сенатар таксама нагадаў пра тое, што 2017 год з'яўляецца юбілейным для нашых адносін з фондам — менавіта 25 гадоў таму было заключана пагадненне з МВФ. «І гэта пагадненне я быў удастоены гонару падпісаць», — дадаў Міхаіл Мясніковіч.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by* ■

## СУЧАСНАЯ МЕДТЭХНІКА Ў НАВАПОЛАЦКУ

**Спонсарская дапамога аднаго з прыватных прадпрыемстваў паспрыяла набыццю сучаснага ўльтрагукавога апарата для Navapolackaj дзіцячай паліклінікі.**

Паводле слоў **старшыні гарвыканкама Дзмітрыя ДЗЯМІДАВА,** новы апарат палепшыць сістэму прафілактыкі розных паталогій у дзяцей. Кіраўнік горада перадаў таксама галоўнаму ўрачу Наваполацкай цэнтральнай гарадской бальніцы сертыфікат на 25 тысяч рублёў для далейшага развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы, якая абслугоўвае каля 18 тысяч дзяцей.

А ў гарадскую бальніцу Наваполацка тым часам даставілі камп'ютарны тамограф, сродкі на які былі выдаткаваны з рэспубліканскага бюджэту. Устаноўлены ён на першым паверсе хірургічнага аддзялення. «Камп'ютарная тамаграфія дапаможа істотна палепшыць якасць медыцынскай дапамогі пры траўмах, неўралагічнай, кардыялагічнай, анкалагічнай паталогіях, нейрахірургічных умяшаннях, — зазначае **галоўны ўрач Наваполацкай ЦГБ Сяргей НЯКРАСАЎ.** — Гэта эканоміць час і расходы, якія раней трэба было затраціць на транспарціроўку пацыентаў у Віцебск або Мінск». Праводзіць КТ-дыягностыку будуць трое спецыяльна падрыхтаваных спецыялістаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ярмошынай Лідзіі Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю СЫНА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ярмошынай Лідзіі Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — раптоўнай смерцю СЫНА.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ярмошынай Лідзіі Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю СЫНА.**



Кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска Ігар БУЗОЎСКІ і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК у час мерапрыемства.

## «СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ» ВАКОЛ ЛІХТАРНАГА СЛУПА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У ходзе работы над аб'ектамі шмат хто задаваў пытанне: а ці трэба гэта рабіць? І толькі людзі, якія разумеюць, што такое душа, каштоўнасці, гісторыя і культура народа, здолелі пераканаць, што такія рэчы складаюць і будучую гісторыю нашай маладой Беларусі, — падчас урачыстага адкрыцця адзначыў **кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска Ігар БУЗОЎСКІ.**

Асноўныя работы па падборы колеравай гамы, выніковы варыянт якой зацвярджаў цэлы савет, і роспісу аб'ектаў узяў на сябе **студэнт пятага курса Акадэміі мастацтваў Аляксандр НЕСЦЯРОВІЧ.** Аляксандр прызнаецца, што перш чым прыступіць да справы, вывучыў велізарны аб'ём інфармацыі, сама ж работа, дзякуючы дапамозе сакурснікаў, заняла каля месяца. Для пяці слупоў абрана аднолькавая колеравая гама і толькі адзін зроблены «пад бронзу». Усе яны распісаны эмальнай фарбай, а зверху пакрытыя стойкім лакам. Так што кожны год абнаўляць іх не прыйдзецца, яны ўстойлівыя да солевага ўздзеяння. Студэнты Акадэміі мастацтваў паабяцалі ўзяць аб'екты пад свой «патранаж». Магчыма, у хуткім часе менавіта ў форме падобных праектаў яны будуць выконваць свае дыпломныя работы.

Сімвалічна, што для роспісу апор быў абраны менавіта Верхні горад, дзе праходзіць мноства культурных мерапрыемстваў, у тым ліку і гістарычнай накіраванасці. Дарэчы, малюнак на апорах у рэнесанснай традыцыі сімвалізуе дрэва жыцця ці трохузроўневую мадэль свету.



Першы намеснік Кіраўніка адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ набывае сувеніры.



Мастак Мікалай МІХАЛАП.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@viazda.by*

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

■ Супрацоўніцтва

## А ЦЯПЕР — БІЗНЕС

**Кіраўнікі 17 гандлёва-прамысловых палат краін Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы абмяркоўвалі ў сталіцы магчымасць удзелу дзелавых колаў у развіцці інфраструктурных праектаў. Як адзначыў старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ, у аснове ЦЕІ ляжыць развіццё інфраструктурнага супрацоўніцтва на ўзроўні транспарту, прамысловай кааперацыі, зняцця абмежаванняў і бар'ераў, выкарыстання фінансавых рэсурсаў, што прапануюць розныя інтэграцыйныя сістэмы.**

«Гэта новыя магчымасці, якія наша краіна зможа выкарыстоўваць. Усе нашы партнёры па ЦЕІ кажуць, што беларускае старшынства адкрывае новую старонку ў развіцці арганізацыі. Да нас прыехалі гандлёва-прамысловыя палаты з 17 краін — тыя структуры, за якімі стаіць бізнес. Акрамя таго, гэтыя краіны азначаюць для нас прыкладна 60% беларускага экспартнага партфеля на еўрапейскім напрамку — некалькі мільярдаў долараў. Развіваючы наша двухбаковае супрацоўніцтва, мы вырашаем дзяржаўную задачу па развіцці экспарту», — падкрэсліў Уладзімір Улаховіч.

Паводле яго слоў, буйны партнёр Беларусі ў Еўропе — Федэрацыя нямецкіх гандлёва-прамысловых палат — выйшаў з ініцыятывай абмеркаваць у рамках гэтай сустрэчы праект бізнес-мемарандума аб агульнай эканамічнай прасторы ад Лісабона да Уладзівастока. «Ніколі яшчэ ў гісторыі ЦЕІ не было сустрэч такога ўзроўню. Гэта сведчыць аб тым, што Беларусь сёння ўспрымаецца ва ўсім свеце не інакш як дзелавы партнёр, як краіна, якая адкрывае зусім новыя магчымасці», — рэзюмаваў Уладзімір Улаховіч.

Намеснік генеральнага сакратара Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы Маргот Клестыль-Лефлер адзначыла, што прыняць старшынства ЦЕІ нашай краінай было вельмі важным палітычным і стратэгічным рашэннем.

«Гэта мае і вялікае значэнне для ўсіх краін Ініцыятывы. Я таксама лічу, што гэта дапаможа зрабіць крокі насустрач умацаванню эканамічнага супрацоўніцтва з Еўрасаюзам», — выказала сваё меркаванне намеснік генеральнага сакратара ЦЕІ.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by* ■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Тэрэза Мэй сфарміравала брытанскі ўрад меншасці



Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі і лідар Кансерватыўнай партыі Тэрэза Мэй сфарміравала ўрад меншасці па выніках датэрміновых усеагульных парламенцкіх выбараў, якія прайшлі ў Злучаным Каралеўстве 8 чэрвеня. Пераважная большасць членаў старога Кабміна захавала свае пасады — у прыватнасці, міністры культуры, знешняга гандлю, адукацыі, транспарту і аховы здароўя. Нечаканасцю стала вяртанне ў склад урада Майкла Гоўва, якога Мэй звольніла з пасады міністра юстыцыі, калі стала кіраўніком кансерватараў.

### Французскія выбаршчыкі ўстанавілі два рэкорды на ўсеагульных выбарах

Паводле ацэнак сацыялагічных службаў, першы тур выбараў у Нацыянальны сход адзначаны самай нізкай актыўнасцю французаў на ўсеагульных выбарах за апошнія шэсць дзесяцігоддзяў. У галасаванні ўдзельнічалі 49% выбаршчыкаў. Найбольшага поспеху дабіўся рух «Рэспубліка на маршы», чыя гісторыя ў французскай палітыцы налічвае крыху больш за год. Гэта аб'яднанне прыхільнікаў новага прэзідэнта рэспублікі Эмануэля Макрона заваявала 32,6% галасоў.

### На рэферэндуме ў Пуэрта-Рыка вырашылі далучыцца да ЗША

Жыхары Пуэрта-Рыка ўхвалілі зварот да Кангрэса ЗША з просьбай далучыць востраў да Амерыкі і зрабіць яго 51-м амерыканскім штатам. Яўка на рэферэндуме склала ўсяго 23%. За далучэнне да ЗША выказаліся 97% тых, хто прыйшоў на выбарчыя ўчасткі. Губернатар Пуэрта-Рыка Рыкарда Росель спадзяецца, што ўваходжанне вострава ў ЗША дазволіць справіцца з эканамічным крызісам. Знешні доўг вострава складае 72 млрд долараў, а ВУП — амаль 103 млрд.

### Бельгія з пачатку года адмовіла ў прытулку больш чым 74% бежанцаў



Аб гэтым паведаміў генеральны камісарыят па справах бежанцаў і апатрыдаў. Ведамства прымяняе «збалансаваны падыход, усталёўваючы легітымныя патрэбы ў абароне і прадухіляючы неабгрунтаваныя просьбы, злоўжыванні і працэдурныя затрымкі», — заўважыў прадстаўнік камісарыята. Дарэчы, летась іміграцыйныя ўлады Бельгіі далі статус бежанца больш чым 14 тысячам просьбітаў.